# Медыкі аб вакцынацыі ад COVID-19: цікавасць высокая, асабліва ў пажылых

***Масавую вакцынацыю супраць COVID-19 плануюць пачаць ужо ў гэтым месяцы. Калі вы яшчэ не запісаліся на прышчэпку, расказваем, як гэта можна зрабіць. Дарэчы, нават выходзіць з дома не давядзецца.***

## Бярэзінская ЦРБ: цікавасць да вакцыны высокая, асабліва ў пажылых

Пра тое, што ў Бярэзінскай ЦРБ можна запісацца на прышчэпку супраць COVID-19, напісана на сайце бальніцы. Пра гэта ж расказваюць пацыентам у час прыёму тэрапеўты, урачы агульнай практыкі і вузкія спецыялісты. У мясцовай газеце раз-пораз выходзяць падрыхтаваныя медыкамі матэрыялы на тэму вакцынацыі. Інфармацыі для мясцовых жыхароў, як лічыць намеснік галоўнага ўрача па медыцынскім абслугоўванні Таццяна Ермакова, дастаткова. Акрамя таго, медработнікі заўсёды гатовы пракансультаваць і адказаць на любыя пытанні.

— Інфармуем насельніцтва вельмі актыўна. Таму, напэўна, і высокая зацікаўленасць з боку людзей, асабліва пажылых. Сёння кожнае структурнае падраздзяленне ЦРБ вядзе папярэдні запіс жадаючых зрабіць прышчэпку: працуе прамая лінія, можна звярнуцца ў фельчарска-акушэрскія пункты, участковыя бальніцы, амбулаторыі па месцы жыхарства. Пацыентам расказваюць пра вакцынацыю, падрыхтоўку да яе і магчымыя рэакцыі арганізма на прышчэпку, — тлумачыць медык. — Так, у перапынку паміж уводам двух кампанентаў прэпарату ад каранавіруса, які складае 21 дзень, асаблівых рэкамендацый няма. Адзінае, лепш выключыць у першыя тры дні алкагольныя напіткі і абмежаваць фізічныя нагрузкі. Акрамя таго, вельмі важна выконваць ахавальны рэжым,

каб не захварэць у міжвакцынальны перыяд.

Паводле слоў Таццяны Ермаковай, цяпер згодна з нацыянальным планам у раёне праходзяць першы і другі этапы вакцынацыі. У першую чаргу прышчапляюцца медработнікі, сацработнікі, настаўнікі. Атрыманыя раней 150 доз вакцыны амаль зрасходаваны.

# Валожынская ЦРБ: гаворым адкрыта пра пабочныя рэакцыі

У Валожынскай ЦРБ таксама запісацца на вакцынацыю можна самымі рознымі спосабамі: па тэлефоне, на сайце медустановы, у рэгістратуры або асабіста на прыёме ва ўрача.

– Варыянтаў на самай справе шмат, і кожны знаходзіць для сябе падыходзячы. З кожным днём усё больш жадаючых зрабіць прышчэпку. Адназначна ў гэтай сітуацыі добра спрацоўвае і сарафаннае радыё, – заўважае галоўны ўрач Валожынскай ЦРБ Павел Ганчар. – Акрамя таго, нашы спецыялісты сустракаюцца з працоўнымі калектывамі, расказваюць, што такое прышчэпка ад каранавіруса, навошта яе трэба рабіць, як яна дзейнічае. Адкрыта гаворым пра магчымыя пабочныя рэакцыі, бо гэта пытанне людзей хвалюе ў першую чаргу.

Павел Алегавіч не ўтойвае, што сярод пацыентаў ёсць і такія, хто да вакцынацыі ставіцца з недаверам. Праўда, іх становіцца ўсё менш.

– Людзі 45-50 гадоў разважаюць: навошта адмаўляцца ад прышчэпкі, калі можна з яе дапамогай уберагчы сябе ад цяжкага цячэння хваробы. Тыя, каму за 60, ведаюць, што знаходзяцца ў групе рызыкі, асабліва маючыя хранічныя захворванні. Хтосьці вырашае заняць пазіцыю чакання: сусед зрабіў, пагляджу, што будзе, і потым вызначуся, – гаворыць галоўны ўрач. – Да таго ж няма забароны рабіць прышчэпку цяпер тым, хто не працуе

медыкам або настаўнікам. Да нас ужо звярталіся людзі, якія хочуць перад ад’ездам у іншую краіну прайсці вакцынацыю. Нікому не адмаўляем!

БЕЛТА